*А.У.МАРОЗАЎ*

# РОЛЯ ДУХОЎНЫХ ВЕРШАЎ У ВУСНАПАЭТЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА (XIX—XX стст.)

Традыцыйная вуснапаэтычная культура і яе феномен фальклор уяўляюць важнейшую крыніцу пазнання духоўнай культуры беларускага народа на працягу розных гістарычных эпох. Разам з тым усебаковы аналіз беларускага фальклору вельмі важны і актуальны з пункту гледжання вывучэння адносін усходнеславянскага язычніцтва і хрысціянства, узаемасувязі рэлігіі і этнічнай спецыфікі народа, што знаходзіць выразны адбітак ва ўзорах матэрыяльнай і духоўнай культуры.

Сапраўднае асваенне духоўнай культуры мінулага патрабуе творчай перапрацоўкі яе каштоўнасцей, дакладнага разумення культурнай спадчыны беларускага народа ў гістарычным аспекце і зусім не звязана з яе ідэалізацыяй. Фальклор, які разумеецца не “музейна” (у якасці збору творчых дасягненняў мінулага), а як сведчанне сацыяльнай сутнасці народаў, з’яўляецца неацэннай крыніцай па-знання гістарычнай спадчыны і сучасных палітычных і культурных працэсаў, што адбываюцца ў постсавецкіх краінах. Між тым духоўныя вершы беларускага народа дзесяцігоддзямі заставаліся па-за сферай навуковых інтарэсаў савецкіх даследчыкаў па той прычыне, што гэтыя творы ўвасобілі ідэалогію, “далёкую ад сапраўднага народнага светапогляду”.

Несумненную навуковую цікавасць мае параўнальны аналіз духоўных вершаў беларускага народа з пункту гледжання праяў у іх адносна цэласнай сукупнасці пачуццяў, думак і ўяўленняў, якая стварае карціну свету і змацоўвае адзінства культурных традыцый народа на працягу стагоддзяў. У гэтай сувязі асаблівае значэнне набывае даследаванне такіх з’яў, як уплыў рэлігіі і царквы на сацыяльнае і духоўнае аблічча беларускага народа, яго культуру і менталітэт, перапляценне рэлігійнага, нацыянальнага ў традыцыях і побыце людзей, адносіны да гістарычнай спадчыны мінулага, помнікаў старажытнарускай і сярэдневяковай культуры ўсходніх славян.

Карціна ўтварэння этнаканфесійнай спецыфікі беларускай культуры будзе няпоўнай, калі не разгледзець працэс пранікнення хрысціянскіх уяўленняў аб звышнатуральным у фальклоры. Пры аналізе зместу духоўных вершаў трэба памятаць, што гэты пласт вуснапаэтычнай культуры з’яўляецца вынікам мастацкай творчасці. У той жа час яны сведчаць аб пазнавальнай дзейнасці народаў Еўропы, якая ажыццяўляецца мастацкімі сродкамі.

Шырока прадстаўленыя ў дарэвалюцыйных фальклорных зборніках П.А.Бяссонава [4], В.Варанцова [10], Е.Р.Раманава [9], П.В.Шэйна [3] духоўныя вершы беларускага народа характарызуюцца агульнасцю сюжэтна-вобразнага складу з падобнымі вуснапаэтычнымі творамі рускага і ўкраінскага народаў: роднаснымі з’яўляюцца асноўныя тэматычныя групы духоўных вершаў на старазапаветныя і евангельскія сюжэты (“Плач Адама”, “Іосіф Прыгожы”, “Вершы аб Прачыстай Дзеве”, “Сон Багародзіцы”, “Нараджэнне Хрыста”, “Пакуты Хрыста, “Узнясенне Хрыста”), аб героях-змеяборцах (“Хвёдар Церын”, “Георгій і цмок”) і велікамучаніках (“Барыс і Глеб”), аб падзвіжніках (“Аляксей, Божы чалавек”) і цудатворцах (“Дзмітрый Салунскі”), аб праведніках і грэшніках (“Лазар”), аб Страшным судзе. Сярод духоўных вершаў асабліва вылучаецца “Галубіная кніга” па маштабнасці ахопу часу і прасторы (ад пачатку да канца свету).

Разглядаючы геаграфічнае распаўсюджанне самабытных вуснапаэтычных твораў, В.А.Бахціна ўслед за Е.Ф.Карскім [6] падкрэслівае, што «ўсе запісы эпічных духоўных вершаў у XIX – пачатку XX ст. зроблены на паўночным усходзе Беларусі, на тэрыторыі, якая мяжуе з Расіяй» [2, с. 468]. Беларускія духоўныя вершы разам з рускімі і ўкраінскімі складаюць велізарны фонд эпічнай і ліра-эпічнай творчасці народаў усходнеславянскай супольнасці. У сваю чаргу духоўныя вершы ўсходніх славян роднасныя духоўным вершам балгарскага, сербскага і іншых паўднёваславянскіх народаў праваслаўнага веравызнання (падобныя творы шырока распаўсюджаны і ў традыцыйнай вуснапаэтычнай культуры румын).

У культуры новага і навейшага часу заходніх славян і заходнееўрапейскіх народаў духоўныя вершы практычна не прадстаўлены. А.М. Весялоўскі бачыў прычыну шырокага

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

распаўсюджання духоўных вершаў у румын, усходніх і паўднёвых славян у праваслаўных асновах іх культуры [5, с. 2]. У сваю чаргу В.Н. Мачульскі, адзначаючы арэалы распаўсюджання рэлігійнай культуры і звязаных з ёй фальклорных твораў, падкрэсліваў "коснасць" і "нясмеласць" у галіне "скаванай латынню" рэлігійнай культуры Захаду і ў процівагу – "бражэнне рэлігійнай думкі, свабодныя адносіны да вытокаў рэлігіі" на Усходзе [8, с. 19].

Праведзены намі аналіз духоўных вершаў як спецыфічнага выяўлення каштоўнасна-арыентаваных асноў усходнеславянскай супольнасці ўказваў на творчую культурастваральную ролю ментальнага ўзроўню ўзаемадзеяння фальклорных твораў праваслаўнага славянства. Гэта адлюстроўваецца ў наяўнасці цесна звязаных з рэлігіяй "аўтаматызмаў" эмоцый і ўяўленняў, а таксама падобных сюжэтна-вобразных структур. Асноватворнае значэнне ў фарміраванні і актыўным функцыянаванні духоўных вершаў мае не столькі "характар" або сацыядынаміка рэлігійнага жыцця ва ўсходніх і паўднёвых славян, колькі ментальныя ўстаноўкі калектыўнага творцы і выканаўцы вуснапаэтычных твораў. Зашыфраваныя ў духоўных вершах уяўленні аб прыродным і сацыяльным свеце з'яўляюцца свайго роду аўтаматызмамі думкі, якія дамінуюць у гушчы грамад-ства: разуменне ўладкавання сусвету і чалавечай прыроды; трактоўка быційнага прызначэння чалавека; успрыманне прасторы і часу і звязанае з імі ўсведамленне гісторыі; успрыманне і перажыванне нараджэння і смерці; суадносіны натуральнага і звышнатуральнага; ацэнка грамадства і яго кампанентаў; разуменне ўлады, панавання і падпарадкавання, інтэрпрэтацыя свабоды і інш. [7].

Фальклорныя тэксты беларускага народа ўвасобілі выпрацаваныя традыцыйнай народнай культурай стэрэатыпныя спосабы бачання і ацэнкі свету, той "ментальны інструментарый", якім карысталася асноўная маса людзей на працягу стагоддзяў. Распрацоўка праблемы даследавання традыцыйнай вуснапаэтычнай творчасці як крыніцы пазнання ментальнасці служыць заслонай супраць вульгарызацыі і дэгуманізацыі гісторыі славян.

Запісы тэкстаў беларускіх духоўных вершаў, якія адносяцца да XIX – пачатку XX ст., сведчаць аб тым, што ў традыцыйнай сістэме каштоўнасных арыентацый вядучае месца займае маральна-этычная праблематыка. У духоўных вершах этычна дасканалае – усё цудоўнае: маральным пачуццям і якасцям беларусаў імпанавала хрысціянства сваімі ідэаламі, светлымі вобразамі, якія бласлаўлялі памяркоўнасць, умеранасць у матэрыяльных патрэбнасцях, добры лад у грамадстве і добры нораў у сям'і. Акрамя вядомага комплексу праваслаўных абрадаў, у народным асяроддзі творча ўсведамляліся хрысціянскія запаведзі: "Паважай бацьку твайго і маці тваю......", "Не забівай", "Не пралюбадзейнічай, «Не крадзі», "Не сведчы ілжыва…...", "Не жадай дома бліжняга твайго......", што знаходзіла мастацкае ўвасабленне ў фальклорных творах.

Абапіраючыся на цесную сувязь з дынамічнымі і рухомымі элементамі масавай свядомасці, рэлігія аказвае істотны ўплыў на грамадскі настрой і думку шырокіх слаёў насельніцтва, якія нярэдка "судзяць" аб учынках чалавека з пазіцыі рэлігійных узораў. Шчырасць і чалавечнасць аб'ядноўваюць шматлікія духоўныя вершы, што прысвечаны рэлігійнаму маральнаму ідэалу – Іісусу Хрысту. Асабліва стрыманым лірызмам і цнатлівасцю надзелены духоўныя вершы пра Багародзіцу.

У народным уяўленні Боская дасканаласць для зямнога чалавека недасягальная. Максімальна магчымае набліжэнне да гэтай дасканаласці ўяўляюць сабой святыя велікамучанікі, якія цалкам прысвяцілі сябе служэнню Стваральніку. Гераізацыяй подзвігу ў імя вышэйшых ідэалаў прасякнуты духоўныя вершы, прысвечаныя Ягорыю Храбраму. Адзін з найбольш любімых фальклорных герояў надзяляецца рысамі быліннага персанажа, увасабляючы самаадданасць і непарушнасць у барацьбе з сіламі зла і цемры.

Хрысціянскі маральны імператыў распаўсюджваецца не толькі на тэматычныя, ідэйна-мастацкія, але і стылістычныя ўласцівасці духоўных вершаў. Знаменныя спевы як мелодыка-інтанацыйная аснова духоўных вершаў дазвалялі перадаць шырокі спектр чалавечых настрояў: ад пяшчотнасці і сузіральнасці да непрымання і рашучага пратэсту, ад радасці і весялосці да асуджэння і гневу. Пад уплывам мастацкіх твораў выканаўцы і слухачы інакш успрымалі рэчаіснасць і адшуквалі ў жыцці тыя колеры і вобразы, якія прыцягвалі іх у рэлігіі і мастацтве.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Генералізаваныя рысы светазнаўства ў класічных тэкстах беларускіх духоўных вершаў маюць цягу да так званай усходняй ментальнасці, пранізанай ідэаламі духоўна арыентаванага быцця, братняй любові і самаахвяравання на карысць агульнай справы. Адлюстраваная ў вуснапаэтычных творах народная вера іграе ролю важнейшага стымулу да фарміравання пэўнай сістэмы філасофскіх, сацыялагічных, эстэтычных і іншых поглядаў.

Разам з тым нельга не адзначыць складанасць і супярэчлівасць духоўных вершаў з пункту гледжання адлюстравання ў іх сапраўды рэлігійных уяўленняў. Змест многіх фальклорных тэкстаў паказвае, што народныя масы па-свойму перапрацоўвалі каноны праваслаўя, набліжаючы іх да сваіх дахрысціянскіх вераванняў. Тая ж “Галубіная кніга” ўтрымлівае звесткі пра д’ябла як пра другую светастваральную істоту, што часткова тлумачыць несправядлівасць, якая адбываецца на зямлі. У беларускіх духоўных вершах, як і ў хрысціянскіх легендах, Бог надзяляецца прыземленымі чалавечымі якасцямі.

Рэлігія ўспрымаецца не ў сваім артадаксальным статусе, а ў якасці “звычайнай веры”: уласна хрысціянскія дагматы своеасабліва інтэрпрэтаваны звычайнай рэлігійнай свядомасцю. Духоўныя вершы як паэзія міласэрнасці і спадзявання на справядлівасць Боскага суда іншы раз сумяшчаюць у сабе пратэст супраць сацыяльнай несправядлівасці (асабліва ў патрабуючых асобнага вывучэння стараверскіх і сектанцкіх вершах). У такіх творах адсутнічае ўласцівая канонам веры арыентацыя духоўнай матрыцы на змяненне самога чалавека як часткі свету і вышэйшай духоўнай субстанцыі ў адпаведнасці з першапачатковай (не грэшнаму чалавеку прыналежнай) Боскай задумай.

У духоўнай культуры беларускага народа бытуюць вуснапаэтычныя творы на хрысціянскія тэмы, якія звязаны з заходняй традыцыяй як па стылістычных уласцівасцях, так і па закладзеных у іх ментальных устаноўках. Беларускія канты і псалмы з’яўляюцца сведчаннем узмацнення працэсу інтэрнацыяналізацыі духоўнай культуры Беларусі эпохі Адраджэння, паколькі нясуць у сабе элементы пазацаркоўнай песеннай культуры, уласцівыя гусіцкім гімнам, лютэранскім і кальвіністцкім харалам.

Аднак шырока вядомая ў Цэнтральнай і Заходняй Еўропе вакальна-харавая песня-гімн (кант) набывае на землях Беларусі ярка выяўленыя нацыянальныя рысы дзякуючы бытаванню ў першую чаргу не ў гарадскім, а ў сялянскім асяроддзі і ўздзеянню з боку песеннай народнай творчасці.

Яшчэ большую сувязь з традыцыйнай вуснапаэтычнай культурай беларускага народа і яго яскравым увасабленнем – духоўнымі вершамі – адлюстроўваюць псалмы. Беларускія псалмы не мелі выключна характар духоўна-маралізатарскага ліра-эпічнага канта і не выконваліся пераважна ў прафесійным і паўпрафесійным асяроддзі лірнікаў, калік вандроўных і інш. Псалмы-калядкі, якія выконваліся ў дзень Раджджаства Хрыстова, былі распаўсюджаны ў Беларусі. Нават ў савецкі час ў шырокіх народных масах бытавалі такія калядныя песні, як «Святы вечар, свят!», «У небе ўсе анёлы купна лікуйце», «Днесь Хрыстос нарадзіўся» і інш. Духоўныя вершы, канты і псалмы сталі неад’емнай часткай масавых прадстаўленняў беларускага батлейкавага тэатра. У іх адлюстроўваліся ўласцівыя сялянскай масе погляды на стварэнне свету, выгнанне з раю Адама і Евы, учынкі Хрыста, Дзевы Марыі і святых.

Сучасная навука рухаецца па шляху сістэмнага аналізу, які ахоплівае моўны стыль, вобразную прадметна-тэматычную дэталізацыю, кампазіцыйна-тэматычны склад, рэлігійны сэнс, жанрава-структурную паўтаральнасць вуснапаэтычных твораў на рэлігійныя сюжэты і вобразы. Вывучэнне сутнасных характарыстык духоўных вершаў, якое дазволіла А.М.Весялоўскаму блізка падысці да абгрунтавання ідэі гістарычнай паэтыкі, патрабуе далейшага асэнсавання. Асаблівай увагі з боку даследчыкаў заслугоўваюць сучасныя запісы вуснапаэтычных твораў. Матэрыялы комплексных экспедыцый ІМЭФ НАН Беларусі, сабраныя ў чарнобыльскай зоне (запісы К.П.Кабашнікава), сведчаць аб прыярытэце каштоўнасцей міласэрнасці і спачування не толькі ў адносінах да людзей, але і да ўсялякіх Боскіх стварэнняў на зямлі. Хрысціянская духоўнасць асабліва яскрава “размалёўвае” паэтычныя звароты да Маці-Зямлі, якая нясе на сабе “грэшнікаў і беззаконнікаў”. Разам з тым запісы апошніх гадоў паказваюць, што карціна канца свету ў духоўных вершах становіцца ўсе больш уражвальнай [1].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларускія духоўныя вершы з'явіліся прыдатнай крыніцай вывучэння фальклорнай традыцыі (на ўзроўнях уласна беларускім, усходнеславянскім, агульнаславянскім і нават агульнаеўрапейскім) з пункту гледжання ўвасаблення ў ёй ідэйна-мастацкага сэнсу. Прыцягненне да аналізу катэгорый багаслоўя садзейнічае даследаванню рэлігійага самапазнання народа з мэтай паказу трансфармацый асноўных хрысціянскіх палажэнняў у звычайнай свядомасці. Подобнае даследаванне важна для пераадолення методык, аднабакова арыентаваных на выяўленне ў фальклорных матэрыялах язычніцкіх, дахрысціянскіх элементаў. Методыка, якая распрацоўваецца для вывучэння беларускіх духоўных вершаў у славянскім і агульнаеўрапейскім кантэксце, накіравана на тэарэтычны і практычны аналіз культурнага ўзаемадзеяння народаў Еўропы і Беларусі ў іх гістарычным мінулым і будучым (з улікам перспектыў па сутнасці хрысціянскай гуманізацыі жыцця, што актуальна ў святле праблем удасканальвання духоўнай культуры розных краін і народаў).

Такім чынам, духоўныя вершы займаюць асаблівае месца ў самабытнай вуснапаэтычнай культуры беларускага народа XIX—XX стст. З аднаго боку, духоўныя вершы ўтвараюць вельмі прыметную, абумоўленую гістарычным развіццём Беларусі частку самабытнай вуснапаэтычнай культуры народа. Яе ментальнаму ўзроўню ўласцівыя элементы звычайнай рэлігійнай свядомасці: у духоўных вершах своеасабліва перапляліся хрысціянскія ўяўленні не толькі з сацыяльным вопытам беларускага народа, але і даволі старадаўнімі язычніцкімі паняццямі і меркаваннямі. Менавіта дзякуючы беларускаму сялянству як носьбіту мовы і своеасаблівага светапогляду вуснапаэтычная культура прымае яскрава выяўленую нацыянальную форму. З другога боку, аналіз узаемадзеянння беларускіх духоўных вершаў з этычнай творчасцю іншых славянскіх народаў, перш за ўсё праваслаўнага веравызнання, указвае на падабенства ментальных установак стваральніка фальклорных твораў і агульнасць іх гістарычных лёсаў. Праваслаўе садзейнічала уніфікацыі формаў грамадскага і духоўнага жыцця старажытнабеларускай народнасці, што пазней абумовіла элементы падабенства вуснапаэтычнай творчасці беларускага, рускага і ўкраінскага народаў, зноў у наш час разведзеных па розных дзяржаўных утварэннях. Распаўсюджанне духоўна-маральных прынцыпаў і арыенціраў хрысціянства важна на рубяжы XX—XXI стст. ва ўмовах разбурэння сацыяльна-палітычнага ўкладу і рэзкай змены каштоўнасных арыентацый.

---

1. *Архіў* Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы НАН Беларусі. Ф. 8, спр. 262, воп. 92, № 9—10.

2. *Бахтина В.А.* Духовные стихи славянских народов (сравнительные аспекты поэтики сюжетов и жанров) // Славянские литературы. Культура и фольклор славянских народов: Докл. рос. делегации на XII междунар. съезде славистов, Краков, 1998. — М.: Наследие, 1998. — С. 465—481.

3. *Белорусские* народные песни с относящимися к ним обрядами, обычаями и суевериями: Сб. П.В.Шейна. — СПб.:Тип. Майкова, 1874.

4. *Бессонов П.А.* Калики перехожие: В 6 вып. — М.: Тип. А.Семена, 1861 – 1864.

5. *Веселовский А.Н.* Разыскания в области русского духовного стиха. 6: Духовные сюжеты в литературе и народной поэзии румын. — СПб.: Тип. Импер. АН, 1883.

6. *Карский Е.Ф.* Белорусы. Т. 3: Очерки словесности белорусского племени. 1. Народная поэзия. — М.: Типолитогр. Т-ва Кушнерев и К°, 1916. — С. 496—531.

7. *Морозов А.В.* Духовные стихи как специфическое выражение ценностно-ориентационных основ восточнославянской общности // Менталитет восточных славян: Тез. междунар. науч. конф., Гомель, 29—31 окт. 1999 г. — Гомель: ГГПУ им. П.А.Сухого, 1999. — С. 46—49.

8. *Мочульский В.Н.* Следы народной Библии в славянской и древнерусской письменности. — Одесса: [Б.и.], 1893.

9. *Романов Е.Р.* Белорусский сборник. Вып. 5: Заговоры, апокрифы и духовные стихи. — Витебск: Типолитогр. Г.А.Малкина, 1891.

10. *Сборник* русских духовных стихов, составленный В.Варенцовым. — СПб.: [Б.и.], 1860. — С. 207—238.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ